# «УСЕ ЖАНРЫ ДОБРЫЯ, АКРАМЯ СУМНАГА»

## *Акцёр, які напрыканцы 70-х паказаў усім «кураня табака», правёў майстар-клас ва Універсітэце культуры*

**У пачатку сустрэчы са студэнтамі знакаміты расійскі артыст і прадзюсар Леанід Ярмольнік шчыра прызнаўся, што ніколі ў жыцці майстар-класаў не даваў. «Я такой назвы насамрэч баюся. Прыйсці і паказаць «кураня табака» — гэта не майстар-клас. Я назваў бы гэта ўсё ж такі размовай па інтарэсах. Я адкрыты для любой тэмы, але тон павінны задаваць вы».**

### «ФЕСТЫВАЛЬ АТРЫМЛІВАЕЦЦА»

— Быць запрошаным на «Лістапад» — вялікі гонар для любога акцёра. Хачу аддаць даніну павагі чалавеку, які ўжо 16 гадоў непакоіцца аб кінафестывалі. Я ведаю, як Расціслаў Іванавіч перажывае, каб фестываль атрымаўся. І ён атрымліваецца. Арыгінальнасць і своеасаблівасць беларускага кінафестывалю заключаецца ў тым, што ў яго рамках праводзяцца сустрэчы накшталт нашай з вамі. Звычайна фестываль гэта, выключна, паказ фільмаў, тусоўкі, п'янкі, новыя знаёмствы, сувязі і ўсё... За тры дні стамляешся, бо і выпіць столькі нельга, і знаёміцца столькі немагчыма.

### «АЛА ПУГАЧОВА ДЗЯЛІЛА СА МНОЙ ПЕРШАЕ МЕСЦА»

— Сучасную моладзь адрознівае, як мне здаецца, дрэннае паглыбленне ў гісторыю. Маё пакаленне неяк больш звяртала ўвагу на старое кіно, на класіку. Сёння вельмі шмат маладых артыстаў, імёны якіх запомніць немагчыма. Яны ўсе здымаюцца з раніцы да вечара. У 38 серыялах, у 150-серыйных фільмах. Яны ўсё ўмеюць рабіць — і плакаць і думаць, але я чамусьці іх не адрозніваю. Мяне ў свой час запомнілі, як «кураня табака». Пантаміма запала тэлегледачам у душу. Але насамрэч гэта была секундная імправізацыя, якую мы прыдумалі з Сашкам Абдулавым у мяне дома. Я ў адзін момант стаў знакамітым. Ала Пугачова дзяліла са мной першае месца. Яна гэта сама гаварыла. Ведаеце, я ніколі не будаваў на гэтым кар'еру. Але зарабляць, шчыра скажу, стаў значна больш. Як толькі ты праявіш сваю індывідуальнасць і зоймеш сваю нішу, адразу ж будзе вырашана пытанне з заробкам. А калі ты такі ж, як яшчэ 100 чалавек, то натуральна пачынаецца ўраўнілаўка. Не ведаю, ці можна пра гэта гаварыць у Беларусі, але пачынаецца так званы сацыялізм. Ва ўсіх заробкі па 110 рублёў... Але гэта сацыялізм у горшым варыянце. Вось кітайцы таксама лічаць, што ў іх сацыялізм, але ён лепшы за амерыканскі капіталізм. Кітайцы зараз зробяць усю планету. Ва ўсіх крызіс, а яны ў шакаладзе. Ва ўсіх ўсё ўпала, у іх усё ўс... *(смяецца)*.

### «Я ДЗІКІ ПРАЦІЎНІК ТАГО, ШТО ЗДЫМАЮЦЦА ФІЛЬМЫ ПРА ЧАЧЭНСКУЮ ВАЙНУ»

— Я праціўнік таго, што цяпер здымаюць фільмы аб нядаўніх падзеях. Перакананы, каб паказаць усё правільна і дакладна, павінна прайсці жыццёвая мітусня і застацца толькі асноўнае. Прынамсі, фільмы пра чачэнскую вайну — гэта заўсёды хлусня. Што могуць пацвердзіць яшчэ жывыя сведкі. Усе гэтыя фільмы, на мой густ, амаральныя. Вас цікавіць, як я стаўлюся да фільма Мікіты Міхалкова «12»? Гэта крадзеж, гэта кіно было ў амерыканцаў. Ён узяў проста і адаптаваў яго да нашай сітуацыі. У канцы фільма Міхалкоў кажа вам — пойдзем і я пакажу, як правільна жыць. Дайце толькі руку. Ён практычна Бог *(смяецца)*. Мікіта, несумненна, прафесіянал найвышэйшага класа, але... Я не вялікі прыхільнік гэтай карціны. Яе канцэпцыя мне не падабаецца. Мікіта апошні час гуляе ў нейкія гульні, і такое адчуванне, што некаму хоча дагадзіць. Як вы думаеце, каму?.. Але пры гэтым магу сказаць, што артысты, якія там здымаліся, ігралі цудоўна.

### «ПАСПРАЧАЎСЯ З АДНАКУРСНІКАМІ, ШТО ГОЛЫ ПЕРАЙДУ ПРАСПЕКТ»

— Вы, напэўна, ведаеце, што студэнт, які паступае на акцёрскі, на першым курсе лічыць сябе народным, на другім курсе ён ужо заслужаны, на трэцім — проста артыст, а на чацвёртым — г...но. Дык вось і мы, калі вучыліся на другім курсе, лічылі, што ўсё можам. Наогул усё. Вось я і паспрачаўся з аднакурснікамі, што голы перайду праспект побач з кінатэатрам «Кастрычнік». Той, хто быў у Маскве, ведае. Зразумела, што ўвесь курс быў у курсе. Усе чакалі відовішча. Ну я таксама не пальцам роблены: прызначыў гэты пераход роўна ў гадзіну ночы. Увесь дзень ніхто не сыходзіць з інстытута. Я сваё слова стрымаў. Праўда, гэта быў крышку іншы час. Тады і транспарту менш было, і святла. Таму бачылі гэта толькі мае аднакурснікі, бо раней у позні час у Маскве нікога не было на вуліцы.

### «ЛЕПШАГА ФІЛЬМА, ЧЫМ «ТОЙ САМЫ МЮНХГАЎЗЕН», НЯМА»

— І не таму, што я там здымаўся. Там кожны кадр запамінальны. Любога з вас падымі — і вы памятаеце ўвесь фільм. Нямногія фільмы гэтым могуць пахваліцца. Я шчаслівчык, бо ў маладым узросце зняўся адразу ў двух фільмах— «Сышчык» і «Той самы Мюнхгаўзен». Адразу пашчасціла працаваць з Захаравым, Горыным, Янкоўскім, Абдулавым... Гэта было нешта неверагоднае. Тады было менш прапаноў і, зразумела, любую прапанову здымацца я заўсёды, яшчэ не чытаючы сцэнару, прымаў. Цяпер жа перабіраю *(усміхаецца)*. Бывае, што месяц не здымаюся, два не здымаюся. Жонка часам кажа: «Вунь іншыя артысты здымаюцца, нават калі кіно дрэннае. Няхай яго ніхто глядзець не будзе, але ж грошы ты атрымаеш». Але сам працэс здымак у дрэнным кіно мяне... Я ведаю, што страчу на гэта вельмі шмат здароўя і нерваў. Таму пастараюся настолькі, наколькі хопіць мазгоў і здаровага сэнсу, вас не засмучаць тым, што звязана з маім імем, і як акцёр, і як прадзюсар.

### «ЗНЯЦЦА Ў ДРЭННЫМ КІНО — ТОЕ Ж САМАЕ, ШТО ПЛЮНУЦЬ У ВЕЧНАСЦЬ»

— Не раю здымацца ў дрэнных фільмах. Калі вам нецікава, не трэба жыць ілюзіяй, што гэта будзе цікава некаму іншаму. Нікога вы, акрамя сябе, не падманеце. Гэтым прынцыпам кіруюся я. Хоць гэта часам нялёгка. Вось Валера Тадароўскі, мой партнёр шматгадовы, спадзяюся, і далей будзем працаваць, адкрыў вялікую колькасць артыстаў, якія сёння суперзоркі. Машкоў, напрыклад, упершыню здымаўся ў фільме Тадароўскага. Чулпан Хаматава таксама. І Жэня Міронаў... Зараз мы з Валерам знялі фільм «Стылягі». Тадароўскі адкрыў такіх маладых талентаў, як Максім Матвееў, Антон Шагін, Ігар Вайнаркоўскі... Я вам гарантую, што яны ў найбліжэйшыя трычатыры гады будуць суперзоркамі. Я, як прадзюсар, іх падчас здымкаў фільма перасцерагаў ад удзелу ў іншых праектах. Не паспееце стаць добрымі артыстамі, як вас сапсуюць, казаў ім. Не паслухалі. Пакуль выходзілі «Стылягі», яны ўжо зняліся ў пяці-шасці фільмах. Адзін горшы за другі. Я згодны, што «зняцца ў дрэнным кіно — тое ж самае, што плюнуць у вечнасць». Дакладней, прабачце, «на... у вечнасць». Гэтак казала Фаіна Георгіеўна Ранеўская, ёй дазволена.

### «Я ТРЫ МЕСЯЦЫ ЎГАВОРВАЎ ЯНКОЎСКАГА ЗДЫМАЦЦА Ў РЭКЛАМЕ»

— Алег Іванавіч Янкоўскі вельмі старанна выбіраў ролі для кіно. Месяцамі вырашаў здымацца ці не. Таму ў яго няма дрэнных роляў. І вось яму прапанавалі стаць тварам аўтамабіля «Вольва». Прапаноўвалі за гэта вельмі добры ганарар. Я тры месяцы ўгаворваў Алега здымацца ў рэкламе. Ён так і не згадзіўся. Зразумела, нельга акцёру, які сябе паважае, рэкламаваць пракладкі ці каўбасу. Мне балюча глядзець на Лену Якаўлеву, калі яна рэкламуе пральны парашок. Цудоўная ж актрыса. Але ёсць рэчы, рэкламаваць якія не сорамна. Ці згадзіўся б я здымацца ў рэкламе? Не прапаноўваюць цяпер, бо ведаюць, што адмоўлюся. Але *(задумаўся)*... я авантурыст па натуры, калі я доўга думаю, дзе мне ўзяць грошы на новае кіно, і тут мне прапаноўваюць зняцца ў рэкламе за 5 мільёнаў долараў, тут жа пагаджуся. Разумееце чаму? Бо ў мяне будзе маральнае апраўданне: я зняўся ў рэкламе і атрымаў за гэта такія вялікія грошы, на якія змагу зняць яшчэ адно кіно з Тадароўскім. Але пяць мільёнаў ніхто ніколі не прапануе. А за 50 тысяч — ніколі.



**«Спадзяюся, што дзякуючы маім парадам вы дапусціце ў жыцці менш памылак».**

### «У МЯНЕ ТАКОЕ АДЧУВАННЕ, ШТО ЯНЫ МЯНЕ КІНУЛІ»

— Сашкі Абдулава ўжо няма амаль два гады, прайшло паўгода, як сышоў Алег Янкоўскі. Я страціў сваіх самых блізкіх сяброў, меркаванне якіх для мяне было самым важным. Я ўзгадваю Абдулава, Янкоўскага, бо не ўзгадваць іх не магу. Дагэтуль не магу звыкнуцца з думкай, што іх няма. У мяне быў нават комплекс, такое адчуванне, што яны мяне кінулі. Што датычыцца Алега, то нам не трэба было пачынаць размову з пачатку, мы маглі пачынаць з канца. Сёння ў мяне няма чалавека, які б мяне да такой ступені разумеў і якога б я так разумеў. Мне ў жыцці больш за ўсё пашанцавала, што я быў сярод гэтых людзей.

### «ГЛЯДЗЕЦЬ І БАЧЫЦЬ, СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ»

— Гадоў да 45 я наогул не звяртаў увагі на надвор'е. Мне было абсалютна абыякава — снег на двары ці дождж, сцюдзёна ці душна. Я ўвесь час працаваў. Раней я не чуў, як спяваюць птушкі, клянуся. Не звяртаў увагі на тое, якімі прыгожымі бываюць кветкі, дагледжанымі газоны. Гэта апошнія пяць-сем гадоў я стаў бачыць і чуць. І вельмі шкадую, што не раней. Пастарайцеся быць у гэтым сэнсе больш мудрымі за мяне, пастарайцеся ўсё прыкмячаць. Не проста глядзець, але і бачыць, не проста слухаць, але і чуць. Вакол вельмі шмат прыгажосці, і яна робіць ваша жыццё больш напоўненым.

**Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ